# ...АМУ ЗАВОДУ - 15 ГАДОЎ





# ...КАЛЕКТЫВУ ... БУДУЧЫНЯ

...каў, маюць шляхі свайго вырашэння. Таму галоўная задача для нас – максімальна нарасціць аб'ёмы вытворчасці. Наша прадукцыя не залежваецца на складах. Усё, што выпусцілі ў бягучым годзе, – прададзена.

Гісторыя нашага завода – гэта, у першую чаргу, гісторыя яго людзей, якія спачатку будавалі карпусы, а цяпер ударна працуюць у цэхах і аддзелах.

На Дошку гонару завода занесены прозвішчы лепшых з лепшых працаўнікоў. Сярод іх – брыгадзір абмотачнага ўчастка ЭнРЦ Франц Бурачэўскі, кантралёр АТК Святлана Апановіч, інжынер-тэхнолаг Уладзімір Вайцянкоў, кладаўшчыца цэха №2 Рэгіна Буйноўская, слесар цэха №3 Мікалай Караваеў, начальнік бюро аддзела збыту Ігар Картавік, эканаміст Вольга Ларына, наладчыкі Міхаіл Сакалоўскі і Сяргей Трухан, фрэзероўшчык цэха №2 Сяргей Кісялевіч. А ўсяго гэтага высокага гонару ўдастоены 19 працаўнікоў завода.

З нагоды юбілею, з нагоды прафесіянальнага свята віншую ўсіх трактарабудаўнікоў, жадаю моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту ў сем'ях.

**Валерый БАРЗЕЕЎ,**
**намеснік дырэктара РУП "Смаргонскі агрэгатны завод".**

***НА ЗДЫМКАХ:** намеснік начальніка аўтаматнага цэха Вячаслаў Камінскі; токар цэха №2 Уладзімір Канапацкі; у адным з цэхаў завода; зборшчыкі Андрэй Аскірка, Аляксандр Сінкевіч, Уладзімір Грышан, Аляксандр Санюк, Аляксандр Махнач, Віталій Каспяровіч, Часлаў Волк, Таццяна Вагера.*

Фота Міхаіла РАЗУМНІКА.

## Нашы землякі

Нядаўна нашаму вядомаму земляку, таленавітаму скульптару Уладзіміру Церабуну, які жыве і працуе ў Гродне, споўнілася 55 гадоў.

З гэтай нагоды ў Смаргонскую цэнтральную бібліятэку былі запрошаны вучні СШ №2, перад якімі выступіла навуковы супрацоўнік гісторыка-краязнаўчага музея Святлана Чагадаева. Яна расказала аб

# ЖЫВЕ Ў ГРОДНЕ МАЙСТАР

жыцці і творчасці Уладзіміра Церабуна, паказала дзецям здымкі 60-х, 70-х гадоў, на якіх адлюстраваны ён сам і яго работы. Асаблівую цікавасць у вучняў выклікалі арыгінальнай формы пасудзіны-скульптуры.

Уладзімір Церабун – рознабаковы майстар. Ён і скульптар, і кераміст, і рэзчык па дрэве. Апошнім часам пачаў ствараць скульптуры на евангельскія тэмы.

Яшчэ будучы студэнтам Мінскага мастацка-тэатральнага інстытута, Уладзімір распрацаваў і ўвасобіў у камені мемарыяльны комплекс на месцы вёскі Дальва, спаленай фашыстамі.

За гэту работу Уладзімір Церабун быў узнагароджаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі.

А ў 1985 годзе наш зямляк атрымаў сярэбраны медаль на ВДНГ СССР за скульптурную кампазіцыю "Расстраляная песня", прысвечаную чылійскаму змагару Віктару Хара.

Шмат работ Уладзіміра Церабуна знаходзіцца ў Гродне, некаторыя свае творы ён падарыў нашаму гісторыка-краязнаўчаму музею.

За гады жыцця і працы ў абласным цэнтры Уладзімір Церабун прыняў удзел у арганізацыі больш за 200 выставак. Персанальных выставак скульптара было 8, з іх 2 – у Смаргоні.

**Ю. ЯТРАНСКІ.**

## ПРА СМАРГОН... АБАРАНКІ

## ТВ

ПЯТНИЦА, 6 ИЮЛЯ

СУББОТА, 7 ИЮЛЯ

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 8 ИЮЛЯ